**Н.А.Ляйко,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт;* **А.І.Фядорына,** *старшы выкладчык*

# ПРАБЛЕМЫ ТЭРМІНАЛОГІІ І ЯКАСЦІ ІНДЭКСАВАННЯ ДАКУМЕНТАЎ: ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

Па прычыне змен у грамадстве, якія звязаны з паскораным развіццём навукі, яе інтэграцыяй, выкарыстаннем сучасных тэхналогій, грамадства ставіць перад бібліятэкамі высокія патрабаванні да своечасовага забеспячэння карыстальнікаў рознабаковай інфармацыяй у зручнай для іх форме, на розных носьбітах і ў кароткі тэрмін.

Пэўная роля ў задавальненні запытаў карыстальнікаў інфармацыі належыць уніфікацыі тэхналагічных працэсаў каталагізацыі. Уніфікацыя тэхналагічных працэсаў – гэта прывядзенне да аднолькавасці тэхналагічных працэсаў у ЦБС або іншай бібліятэчнай сістэме з мэтай павышэння якасці і аператыўнасці выконваемых аперацый, стварэння ўмоў для ўкаранення тэхнічных сродкаў і інш. [10, с. 193–194].

Адным з асноўных тэхналагічных працэсаў каталагізацыі з'яўляецца індэксаванне дакументаў. Паколькі індэксаванне дакументаў мае самае непасрэднае дачыненне да задавальнення запытаў карыстальнікаў інфармацыі, яму надаецца пэўная ўвага ў прафесійнай падрыхтоўцы бібліятэчных работнікаў на ўсіх узроўнях: сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, павышэнні кваліфікацыі, самаадукацыі. Улічваючы важнасць раздзела "Індэксаванне дакументаў" у курсах "Каталагізацыя дакументаў" і "Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў" пры падрыхтоўцы бібліятэчных работнікаў, на нашу думку, неабходна звярнуцца да тэарэтычных асноў індэксавання дакументаў: тэрміналогіі, класіфікацыйных інфармацыйна-пошукавых моў (ІПМ), якасці індэксавання.

Уніфікацыя тэрміналогіі каталагізацыі – адна з важнейшых задач сучаснай бібліятэчнай супольнасці на міжнародным узроўні. Эфектыўным сродкам упарадкавання тэрміналогіі з'яўляецца стандартызацыя. У працэсе перагляду стандартаў мяняецца тэрміналогія, якая садзейнічае збліжэнню лексікі розных дысцыплін. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў адпаведных матэрыялах, размешчаных у спецыяльным друку. Без дакладных

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

азначэнняў і адпаведнага нарматыўнага забеспячэння немагчыма якасная прафесіянальная падрыхтоўка спецыялістаў.

Тэрмін "індэксаванне" ў нашай краіне пачаў выкарыстоўвацца адносна нядаўна, з пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя, у сувязі з укараненнем стандарта ГОСТ 7.59-90 "Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации". Дынамічнае развіццё айчыннай навукі ў галіне каталагізацыі паступова замяніла існуючыя раней тэрміны "класіфікацыя", "класіфіцыраванне" на шырока выкарыстоўваемыя ў 80–90-я гг. XX ст. "сістэматызацыя" і "прадметызацыя", якія былі абгрунтаваны стандартамі ГОСТ 7.44-84 "Систематизация документов" і ГОСТ 7.45-84 "Предметизация документов". І толькі ў выданнях табліц УДК выкарыстоўваўся тэрмін "індэксаванне дакументаў".

У адпаведнасці з ГОСТ 7.59-90 "Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации", распрацаваным на аснове МС ІСО 5963-85 "Документация – методы анализа документов, определения их тематики и выбора терминов индексирования", быў уведзены тэрмін "індэксаванне", устаноўлены агульныя патрабаванні да індэксавання – сістэматызацыі і прадметызацыі дакументаў і інфармацыйна-пошукавых моў. У сувязі са зменамі ў класіфікацыйнай практыцы і з'яўленнем шэрага новых тэрміналагічных стандартаў (7.73-96, 7.74-96, 7.76-96) і шырокім выкарыстаннем сучасных тэхналогій у адноўленым стандарце ГОСТ 7.59-2003 "Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации" [1] істотна ўпарадкавана тэрміналогія, удакладнены пералік назваў класіфікацыйных сістэм, вызначаны прынцыпы індэксавання: класіфікацыйны і прадметызацыйны, – патрабаванні да інфармацыйна-пошукавых моў, тэхналагічныя працэсы і асноўныя правілы індэксавання.

Аналіз спецыяльнай літаратуры і перыядычных выданняў сведчыць аб тым, што значныя поспехі ў галіне індэксавання дасягнуты ў 70-я гг. XX ст. У гэты перыяд была зроблена спроба вызначэння якасці індэксавання і звязанай з гэтым эфектыўнасці выкарыстання сістэматычнага каталога. Т.Н.Ахалая праведзена даследаванне па вызначэнні якасці сістэматычнага каталога і эфектыўнасці яго выкарыстання, задавальнення запытаў карыстальнікаў інфармацыі з дапамогай сістэматычнага каталога. У даследаванні разглядаліся функцыянальныя і эрганамічныя

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

паказчыкі якасці каталогаў [9; 10]. Безумоўна, значная роля ў вызначэнні асноўнага паказчыка якасці – функцыянальнага – належыць якасці індэксавання і выкарыстання класіфікацыйных сістэм.

На сучасным этапе большасць даследаванняў у галіне каталагізацыі адносіцца да аўтаматызацыі каталагізацыйных працэсаў, выкарыстання інфармацыйна-пошукавых моў ва ўмовах аўтаматызацыі, распрацоўкі новых тэхналагічных працэсаў, выкарыстання не толькі апрабіраваных класіфікацыйных сістэм, такіх як УДК, ББК, Рубрыкатар ДРНТІ, у якасці інфармацыйна-пошукавых моў (ІПМ), але і прымянення новых ІПМ, новых тэрмінаў пры індэксаванні. У прыватнасці, у ГОСТ 7.74-96 да ўдакладненага тэрміна "індэксаванне", якое азначае "выражэнне зместу дакумента і/або сэнсу інфармацыйнага запыту на інфармацыйна-пошукавай мове", дадаецца ўдакладненне: "Прысваенне даным або дакументам класіфікацыйных індэксаў у адпаведнасці з правіламі якой-небудзь класіфікацыйнай ІПМ" [3, с. 19].

Адрозніваюць класіфікацыйнае, прадметызацыйнае і каардынатнае індэксаванне. У стандарце прыводзяцца адпаведныя азначэнні кожнаму з гэтых працэсаў. Класіфікацыйнае індэксаванне падаецца як "прысваенне даным або дакументам класіфікацыйных індэксаў у адпаведнасці з правіламі якой-небудзь класіфікацыйнай ІПМ" [3, с. 19]. Прадметызацыйнае індэксаванне – гэта індэксаванне прадметнага зместу дакументаў, якое ажыццяўляецца сродкамі мовы прадметных рубрык. У апошнія гады ва ўмовах аўтаматызацыі шырока выкарыстоўваецца каардынатнае індэксаванне, якое прадугледжвае "многааспектнае выражэнне асноўнага сэнсавага зместу дакумента або сэнсавага зместу інфармацыйнага запыту мноствам ключавых слоў або дэскрыптараў". Адным з метадаў каардынатнага індэксавання з'яўляецца свабоднае індэксаванне, тэхналогія якога не прадугледжвае замену ключавых слоў тэксту ў адпаведнасці з рэкамендацыямі спецыяльнага слоўніка [3, с. 20].

Існуе яшчэ шэраг новых тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца пры індэксаванні дакументаў на сучасным этапе, у тым ліку "аўтаматычнае індэксаванне", "аўтаматызаванае індэксаванне", "цэнтралізаванае індэксаванне" і інш. Пакуль няма дакладнасці і недастаткова распрацавана тэорыя якасці індэксавання. У ГОСТ 7.74-96 "Информационно-поисковые языки. Термины и

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

определения” даюцца азначэнні “паўнаты” і “спецыфічнасці індэксавання” [3, с. 20].

Тэрміны і азначэнні асноўных паняццяў тэорыі УДК, вызначаныя ў ГОСТ 7.90-2007 “Универсальная десятичная классификация. Структура, правила ведения и индексирования”, заслугоўваюць асаблівай увагі і асобнага разгляду.

Рэфармаванне айчыннай сістэмы вышэйшай адукацыі ва ўмовах сацыяльна-эканамічных змен у нашай краіне, укараненне дзяржаўных адукацыйных стандартаў, павелічэнне аб’ёмаў самастойнай работы студэнтаў, развіццё і ўкараненне ў вучэбны працэс і практычную дзейнасць бібліятэк новых інфармацыйных тэхналогій паставілі перад выкладчыкамі вышэйшай школы задачу стварэння новых вучэбных дапаможнікаў для рэалізацыі адукацыйных праграм, якія прадугледжваюць якасна больш высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы.

Уяўляецца, што сучасны каталагізатар павінен дасканала валодаць методыкай сістэматызацыі дакументаў па розных класіфікацыйных сістэмах. Вывучэнне раздзела “Індэксаванне дакументаў” прадугледжвае засваенне не толькі паняційна-тэрміналагічнага апарату, але і практычных уменняў работы з канкрэтнымі ІПМ (УДК, ББК, ДРНТІ і інш.), метадаў і тэхналогій індэксавання. Больш глыбокае авалодванне спецыфікай выкарыстання розных класіфікацыйных сістэм ва ўмовах аўтаматызацыі можа быць забяспечана пры вывучэнні дысцыплін спецыялізацыі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

___________

1. *ГОСТ 7.59-2003.* Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации. – Взамен ГОСТ 7.59–90; введ. 2006-03-01. –М., 2006.–5 с.

2. *ГОСТ 7.66-92.* Индексирование документов. Общие требования к координатному индексированию. – Введ. 01.01.1993. – М., 1992. – 5 с.

3. *ГОСТ 7.74-96.* Информационно–поисковые языки. Термины и определения.– Введ. 01.07.97. – М., 1997. – 34 с.

4. *ГОСТ 7.76-96.* Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения. – Введ. 01.01.98. – М., 1997. – 47 с.

5. *Библиотечное* дело: терминол. словарь / РГБ. – 3-е изд., перераб. и доп. – М., 1997. – 168 с.

6. *Гендина, Н.И.* Проблемы теории классификации и качества индексирования в зеркале гипертекстового словаря / Н.И.Гендина, И.Л.Скипор // Шестая Международная конференция “Крым-99” [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: // cs.libfl.ru/win/rudomino /crimea/gendina 2/html.

7. *Гречановская, А.Г.* Индексирование входного потока документов для формирования массивов электронного каталога // Навукова-даследчая дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на мяжы стагоддзяў: зб. навук. прац / А.Г.Гречановская, Т.А.Маковец. – Мн.: Красіка–Прынт, 2002. – С. 163–168.

8. *Зупарова, Л.Б.* Аналитико-синтетическая переработка информации: учеб. для студентов высш. учеб. заведений по специальности 052700 – Библиотечно-информационная деятельность / Л.Б.Зупарова, Т.А.Зайцева.– М.: ФАИР, 2007. – 400 с.

9. *Определение* качества систематического каталога: метод. рекомендации / ГБЛ; сост. Т.Н.Ахалая. – М., 1983. – 64 с.

10. *Определение* эффективности использования каталогов: метод. рекомендации / ГБЛ; сост. Т.Н.Ахалая. – М., 1985.– 55 с.

11. *Сукиасян, Э.Р.* Школа индексирования: практ. пособие / Э.Р.Сукиасян. – М.: Либерея-Бибинформ, 2005. – 144 с.

12. *Терминологический* словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания / [сост. Т.З.Высоцкая (отв. ред.), В.А.Врубель, А.Б.Маслов, Л.К.Розеншильд]. – М., 1995. – 268 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ